„Разьвіць узмоцненую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў“ (ЦК УсеКП(б)

Пралетары ўсіх краін, аб'ядайцеся!

Зьвязда

Орган ЦК і Мін. Гарнему Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
(№ 236 (4341)
Пяцідзелак 31 жніўня
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫНКА.

ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ—ВА УСЕ ГАЛІНЫ калгаснага вытворства

АПАРТУНІСТЫ З ДРЫСЕНСКАГА І КРУПСКАГА РАЁНАЎ ТАРМОЗЯЦЬ УМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ

ЗЛАМАЦЬ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ КУЛАКА, БЯЗЬЛІТАСНА ЗМАГАЦЦА З ЯГО АГЕНТАМІ—ПРАВЫМІ І „ЛЕВЫМІ“ АПАРТУНІСТАМІ

Па-бальшавіцку выканаць пляны асеньня-зімовых перавозак

Чыгуначны транспарт БССР шчыльне падышоў да асеньня-зімовых перавозак.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове ад 3-га жніўня гэтага году канстатаваў, што на многіх рашаючых участках (у першую чаргу—Віцебск, Магілеў, Ворша) чыгуначны транспарт БССР падрыхтаваўся да перавозак слабо.

Ліпеньскі план пагрузкі па чыгуначным транспорце БССР не давыкананы на 20%. У ліпені пагрузка зьнізана супроць чэрвеня на 4 проц. За 19 дзён жніўня на Зах. чыгунцы, па віне чыгуначнікаў, штодзённа не дагружалася ў сярэднім па 365 вагонаў, па віне ўкраінскіх чыгунак 176 вагонаў. На Зах. чыгунцы за гэты-ж тэрмін штодзённа заставалася пад выгрузкай у сярэднім 755 вагонаў.

Па чыгунцы МБЖ за 19 дзён жніўня было падагружана 2743 вагоны, прычым па віне чыгунак 1624 вагоны. Пад выгрузкай застаялася па чыгунцы МБЖ у сярэднім па 86,5 ваг.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што тыя ЗРУХІ, якія адбыліся на чыгунцы за апошні перыяд, яшчэ далёка невыстарчальны, што патрэбна штодзён на ўпартая работа па далейшаму узмацненьню транспарту.

Зараз пачаўся самы адказны момант грузавых апэрацый. Плановыя бесьперабойныя грузаперавозкі збожжа, лесу, буданматэрыялаў, гародніны і г. д. павінны быць поўнасьцю забясьпечаны КЛІЕНТУРАЙ згодна предугледжаных планаў і своечасова дастаўлены чыгунцы. Між тым трэба адзначыць, што кліентура да сямога апошняга часу працягвае зрываць работу чыгуначнага транспарту, не гледзячы на суровую дырэктыву ЦК КП(б)Б і СНК аб матар'яльнай і судовай адказнасьці за невыкананьне кліентурай узятых на сябе абавязкаў. Кліентура не прад'яўляе грузаў у тэрміны, предугледжаныя дагаворамі і вынікае залукі. Узорная праверка выкананьня дагавораў рубрыкі зьявіцца першым стымулам своечасовай падвозкі і дастаўкі грузаў.

Дагэтуль яшчэ адсутнічае КАНТАКТ У РАБОЦЕ ПАМІЖ ЧЫГУНАЧНЫМ І РАЧНЫМ ТРАНСПАРТАМ. Чыгуначны транспарт не выкарыстоўвае свае правы на перадачу поўных відаў грузаў, якія могуць быць перавезены рачным транспартам.

ТОРМІНОВАЯ РАЗГРУЗКА ЧЫГУНАЧНЫХ ВУЗЛОЎ — ВАЖНЕЙШАЯ УМОВА ПАСКАРЭНЬНЯ АБАРОТУ ВАГОННАГА ПАРКУ.

На кожным чыгуначным вузле, на кожнай станцыі трэба ў тэрміновым парадку стварыць тройкі з адказных працоўнікоў, якія павінны будуць пільна сачыць за разгрузкай чыгунак.

Дрэннае становішча ў падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак трэба перш за ўсё тлумачыць тым, што з боку раду партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых, арганізацый чыгункі была пралупена стадыя на сямёрк, ня былі поўнасьцю выкарыстаны ўнутраныя рэсурсы, дрэнна рэгістраўлена рабочая сіла, адсутнічала напяжанне кіраўніцтва вытворчымі народамі і ўдарніцкім рухам. Адсутнічала выразная планавасьць у рабоце. Мае месца зусім слабае ўкараненьне адзінаначальня, няўменьне маніпуляваньне перавозак, нявыстарчальна рашучае ўкараненьне гаспадарчага разлікунку ва ўсіх зьвеньнях транспарту, будаўнічых і пагрузачна-разгрузачных работах, слабая працыдысцыпліна і г. д.

СПАРАНАЯ ЯЗДА І па сёньняшні дзень яшчэ поўнасьцю не замацавана.

ЦК КП(б)Б сваёй пастановай ад 3-га жніўня, 2-гі пленум Белбюро ЦК чыгуначнікаў пастановамі ад 21-га жніўня і ЦК чыгуначнікаў СССР сваёй пастановай аб асеньня-зімовых перавозках намецілі цэлую сыстэму канкрэтных мерапрыемстваў, ажыцьцяўленьне якіх павінна поўнасьцю забясьпечыць арганізацыю працы па-новаму ва ўсіх зьвеньнях чыгуначнага транспарту.

Правядзеньне ў жыцьцё гэтых дырэктыў павінна быць асноўным зьместам усёй работы на бліжэйшы перыяд часу партыйных, прафэсыянальных, камсамольскіх і гаспадарчых арганізацый чыгуначнага транспарту БССР.

Важнейшай задачай па дэпо на сёньняшні дзень зьяўляецца ПРАВІЛЬНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ І РАССТАНОЎКА РАБОЧАЙ СІЛЫ, стварэньне невялікіх спэцыялізаваных брыгад, спэцыялізацыя абслугаваньня, паспартызацыя варштатаў і арганізацыя кантролю за якасьцю продукцыі.

ЦК чыгуначнікаў вынес важнейшую пастанову аб пераводзе ня менш 75 проц. усіх рабочых дэпо на НЕАБМЕЖАВАНУЮ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ « павышэньнем заработнай платы кваліфікаваным вядучым прафэсіям у сярэднім на 14-15 проц.

Ажыцьцяўленьне ў тэрміновым парадку гэтых мерапрыемстваў—сапраўдны шлях да поўнай ЛІКВІДАЦЫІ АБЯЗЬЛІЧКІ І ЎРАЎНІЛАЎКІ Ў ДЭПО, да паляпшэньня якасьці РАМОНТУ перавознага і вагоннага парку, замацаваньня спаранай язды, паляпшэньня працдысцыпліны і ліквідацыі цякучасьці.

Дзякуючы правільнай арганізацыі і расстаноўцы рабочай сілы дэпо Гомель ужо ДАБІЛАСЯ ПЕРШЫХ ПЕРАМОГ У ДАВЯДЗЕНЬНІ РАМОНТУ ПАРАВОЗАЎ ДА 3 ДЗЁН ЗАМЕСТ РАНЕЙШЫХ 12 ДЗЁН.

На многіх станцыях, асабліва на малых перагоначных, пануе поўная безгаспадарчасьць і безадказнасьць за даручаную работу. Адсутнічае пляновасьць у рабоце, наглад масмасьці, антысанітарнае становішча.

Арганізацыя пастаянных зьмен, прымацаваньне саставных брыгад да поўных перавозаў, нормальнае паляпшэньне санітарнага становішча, узмацненьне адказнасьці за даручаную работу, ліквідацыя абязьлічкі—усё гэта павінна паляпшыць работу станцый.

На станцыі Лясіна-Астроўская была праведзена арганізацыя дыспэтчэрскага кіраўніцтва манэўровымі работамі на сартавочных станцыях. Гэты вопыт даў добрыя вынікі. Яго трэба перанесьці на чыгункі БССР.

Працягваючы рашучую барацьбу за выкананьне дакладнага ГРАФІКА РУХУ цягнікоў адначасова неабходна павысіць адказнасьць за гэту работу ДЫСПЭТЧЭРСКАГА АПАРАТУ. Дыспэтчэр, як і начальнік станцыі, машыніст паравозу, начальнік дапо павінны працавець чотка і выразна, як мэханізм гадзіньніка, пільна сачыць за рухам цягнікоў, каб ні адна лішкія мінута ня ішла на прастой паравознага і вагоннага парку.

Таксама неабходна рашуча ўзмацніць барацьбу з прагульшчыкамі, гультаямі і рвачамі, якія наносяць вялікія страты транспарту.

Трэба пакончыць з апартуністычнай недахопнай работы ГРУЗЧЫКАЎ, сярод якіх цякучасьць асабліва вялікая. У гэтым годзе, як вядома, на пагрузачна-разгрузачных работах не хапае вялікай колькасьці грузчыкаў. На сёньняшні дзень для чыгуначнага і воднага транспарту СССР не хапае каля 100 тыс. грузчыкаў. Прычына гэтага—поўнае раўнодушэньне на самацёк. Гаспадарчыя, партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі чыгуначнага транспарту зусім забыліся аб новых умовах вярбоўкі рабочай сілы.

ЦК чыгуначнікаў намеціў рад канкрэтных мерапрыемстваў, якія павінны былі забясьпечыць прыток грузчыкаў. У прыватнасьці грузчыкі цяпер прыраўнены ў забясьпячэньні да асноўных кадраў рабочых чыгуначнікаў. На грузчыкаў, як на членаў прафсаюзу чыгуначнікаў, будуць распаўсюджаны ўсе льготы, якія прадастаўляюцца транспартнікам па льготным праезьдзе, апалу, і г. д. Зарплата грузчыкаў павялічваецца ў сярэднім на 20-25 проц., узводзіцца прагрэсыўная зьдзельшчына.

Трэба ў тэрміновым парадку арганізаваць для грузчыкаў крупна-сутачнае абслугоўваньне гарачымі сьнеданьнямі і вячэрамі і карэнным чынам паляпшыць забясьпячэньне. Ва ўдарным парадку трэба скончыць будаўніцтва баракаў, памыўкаваньня і чакалень для грузчыкаў і кандуктарскіх брыгад.

Наступіўшы час асеньня-зімовых перавозак, патрабуе ўсямернага напружаньня ўсіх сіл пралетарскай грамадзкасьці транспарту.

На аснове шырока разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі рашуча выкрываючы ўсе недахопы работы чыгуначнага транспарту, трэба ўмець знаходзіць і паказваць масам узорныя прыклады работы лепшых ударнікаў, лепшых арганізатараў і ініцыятараў сацыялістычнай працы і перабудовы работы па-новаму ў адпаведнасьці з апошняй прамовай тав. Сталіна і апошнімі дырэктывамі партыі і ўраду аб чыгуначным транспарце.

Арганізаваць масы чыгуначнікаў і інжынэрна-тэхнічны пэрсанал, каб поўнасьцю выканаць пляны асеньня-зімовых перавозак трэцяга рашаючага году пяцігодкі—такая неадкладная задача партыйных, камсамольскіх, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый чыгунак БССР.

Патрэбны рашучыя меры

ДРЫСА. Раённыя зямельна-калгасныя арганізацыі вельмі мала аддаюць увагі арганізацыйна - гаспадарчаму замацаваньню калгасаў. У прыватнасьці агрэмаджаньне азімых і яравых пасеваў нова-ўступіўшых калгаснікаў амаль ні ў адным з арганізаваных увесну калгасаў не праведзена. Кулацкай агітацыі, накіраванай супроць агрэмаджаньня, ня дан рашучы адпор.

У Серадняксўскім сельсавеце пад шыльдай калектыўнай уборкі фактычна сарвалі агрэмаджаньне пасеваў. Калектыўна ўбраны ўраджай заставаўся на полі і кожны калгаснік забіраў яго сябе, інакш кажучы правялі раздачу ўраджаю агрэмаджаных пасеваў па кулака-маемасным прынцыпе. Такая практыка зьявілася ў выніку апартуністычнай ўстаноўкі раённых работнікаў, данай на пленуме РВК, дзе работнікам калгасаў і сельсаветаў было сказана, што галоўная ўвага павінна быць зьвернута на агрэмаджаньне ільну, а ў адносінах астатніх культур не вялікая бяда, калі яны і ня будуць агрэмаджаны.

Пастанова НКЗ і Калгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмеркаваньні даходаў у калгасах не распрацавана. У выніку гэтага ёсьць моманты, калі калгасы адразу-ж ары ўборцы ня толькі разьмяркоўваюць, а нават разбазарваюць ураджай. У калгасе «Чырвоны сьцяг» Каркалецкага сельсавету, упачы калгаснікі прывозілі па тры вазы сена на рынак. У той-жа час, зусім ня зьвернута ўвага на забясьпячэньне кармамі агрэмаджанай жывёлы.

Рад пералічаных фактаў прымушае біць трывогу, бо бязьдзейнасьць райарганізацый (Райкалгассаюзу і інш.) ставіць пад рэальную пагрозу арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў.

Апартуністычнай недаацэнцы гэтага пытаньня трэба даць рашучы адпор. РК КП(б)Б павінен узмацніць барацьбу з апартуністычнымі скажэньнямі дырэктыў партыі і даць рашучы адпор кулацкім хітрыкам, накіраваным на падрыў эканамічнай моцы калгасаў.

Брыгада:
ЯЦКЕВІЧ, КАЗЛОЎ І КАНОНЧЫК.

„Прымем у калгас каго захочам“

ВУЗДА. Калгас імя 1-га мая Стальбаўскага сельсавету арганізаваўся ў часе жніва з 8 гаспадарак. У калгас уступілі падлягаючыя раскулачваньню Бохан Язэп і Бохан Апэсь, а таксама тыя, якія разбазарывалі сваю маемасьць (Дзямідовіч Васіль, Гурская Эфрасіньня і інш) да якіх даведзены цьвёрдыя заданьні.

Кулакі і іх падгадоскі вядуць калгас да развалу і гэтым хочуць скампрамэтаваць калектывізацыю. Кулакі меркавалі пасаджаць лепшае сена, ім гэта часткова ўдалося. Звыш 30 кап сена згніло на сенажаці, вялізарныя стагі былі складзены ня добра і зараз сена псуецца.

Кулакі-«калгаснікі» затарнаілі прыліў у калгас. Старшыня калгасу кажа: «У калгас мы прымем самае большае 6 адпаасобнікаў і то тых, якіх мы захочам». Калі член сельсавету Харнон Язэп падаў заяву аб прыёме яго ў калгас, перад ім былі настаўлены такія шкурныя запатрабаваньні: «Дзе кожную карову і каня на 4 вазы сена і адзін усе гроны, што зараз у 1931 г. На ўсе па даныя заявы адпаасобнікаў дагэтуль няма адказу.

Старшыня Стальбаўскага сельсавету Жыгаліковіч ведае пра ўсе гэтыя хітрыкі кулакоў, але ня прымае ніякіх захадаў, а наадварот садзейнічае кулацкай працы.

Райкалгассаюз і РКК РСІ павінны зацікавіцца калгасам 1-га мая, вытнець адтуль кулакоў і даць магчымасьць бядняцка-серадняцкаму сялянству ўступіць у калгас.

АН. ШУСТРЫ.

Перавесьці ўсе калгасы на зьдзельшчыну

ЦЕРАХАЎКА. Дырэктыва партыі і ўраду аб пераводзе ўсіх калгасаў на зьдзельшчыну рабіцца зямельна-калгаснымі органамі Церахаўскага раёну да гэтага часу ня выканана. З 69 калгасаў на зьдзельшчыну пераведзены 43.

Райкалгассаюз надарыў мала аддае ўвагі зьдзельшчыне. Пасланыя райкалгассаюзам 2 агрэномы ў калгасы нічога ня робяць у напрамку ўвядзеньня зьдзельшчыны. Райкалгассаюз, пасылаючы іх, не дае канкрэтнага заданьня.

РК КП(б)Б мабілізаваў 14 раённых працаўнікоў і перадаў іх райкалгассаюзу для скарыстаньня па ўвядзеньні зьдзельшчыны ў калгасах, але райкалгассаюз ня адолеў іх выкарыстаць і гэтыя людзі не правялі ніякай работы.

Трэба ўзварухнуць Церахаўскі райкалгассаюз, каб ён па-сапраўднаму ўзяўся за ўвядзеньне зьдзельшчыны і ўліку працы ў калгасах і гэтым самым забясьпечыў арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў

П. Р.

Выгнаць кулацкіх агентаў з калгасу

КРУПКІ. У вёсцы Восава, Жабрынскага сельсавету, арганізаваўся калгас. У калгасе знаходзіцца палова вёскі, але праца пастаўлена надзвычай дрэнна. Зьдзельшчына ня ўведзена. Калі чэка праўленьня Кручок на сходзе ўзьняў пытаньне аб увядзеньні зьдзельшчыны, дык старшыня калгасу Буры Сідар з астатнімі членамі праўленьня высунулі супроць. Працоўныя книжкі ня выданы калгаснікам.

У выніку ўсяго гэтага 15 гэктараў сенажаці ішло ня скошана, а 5 гэктараў скошанага сена ніе наўбраным. У гэты самы час старшыня калгасу дазволіў кожнаму калгаснику прадаць па 2-3 вазы сена.

На просьбы калгаснікаў пераабраць праўленьне райкалгассаюз зусім не рэагуе.

Трэба прыняць тэрміновыя захады, каб ачысьціць праўленьне калгасу і калгас ад кулацкіх агентаў. Неабходна спыніць разбазарваньне кармоў.

Калгаснік.

АБ ПАРАДКУ АДЛІЧЭНЬНЯЎ З АГУЛЬНЫХ ПРЫБЫТКАЎ КАЛГАСАЎ У НЕПАДЗЕЛЬНЫ І ІНШЫЯ ГРАМАДЗКІЯ ФОНДЫ

УСІМ РАЙКАЛГАССАЮЗАМ

УСТАНАЎЛЯЕЦЦА НАСТУПНЫ ПАРАДАК АДЛІЧЭНЬНЯЎ У НЕПАДЗЕЛЬНЫЯ І ІНШЫЯ ГРАМАДЗКІЯ ФОНДЫ: З АГУЛЬНЫХ ПРЫБЫТКАЎ КАЛГАСУ РОБЯЦЦА АДЛІЧЭНЬНІ НАСЕННАГА, ФУРАЖНАГА, ЗАПАСНОГА ФУРАЖНАГА ФОНДУ НА ВЫПЛАТУ НАДАТКУ, СТРАХОЎКІ І ПЛАЦЯЖОЎ ПА КРЭДЫТАХ 1931 Г.

ПАСЬЛЯ ПАКАЗАНЫХ АДЛІЧЭНЬНЯЎ З РЭШТЫ СУМЫ ДАХОДАЎ РОБЯЦЦА АДЛІЧЭНЬНІ Ў НЕПАДЗЕЛЬНЫЯ І ІНШЫЯ ГРАМАДЗКІЯ ФОНДЫ.

СТАРШЫНЯ КАЛГАСЦЭНТРУ БССР МІЦЬКОЎ.

Узьняць 1.670.000 га зяблева

Калгасцэнтр, Наркамзем і Трактарацэнтр на ўжылі энэргічных захадаў для таго, каб забясьпечыць насьпяковае разгортваньне зяблева

Да 1 верасьня ў нас павінна быць узьнята 15 проц. пляну зяблева. Між тым толькі незначная частка раёнаў пачала зяблева. МТС разгортваюць зяблева таксама надзвычай марудна.

Калі на 20 жніўня МТС план зяблева выканалі на 4,1 проц., дык пяцідзёўна з 20 па 25 жніўня дапа вельмі нізкі прырост. На 25 жніўня МТС узьнялі 4,8 проц. пляну.

Ня гледзячы на неадпаразовыя нашы сыгналы, рад МТС апартуністычна недаацэньваюць зяблева і ігнаруюць яго. Напрыклад, Сіроцінская МТС выканала план толькі на 0,4 проц., Расонская — на 1,1 проц., Зеслаўская — 1,4 проц., Лёзьнянская—1,5 проц., Асьвейская — 1,8 проц. і Касьцюковіцкая—1,9 проц.

Яшчэ горш праходзіць ворыва цаліны. МТС павінны ўзьняць 110.600 гэкт. цаліных зямель. На 25 жніўня ўзьнята толькі 2.525 гэкт. цаліны — 2,3 проц. Толькі 10 МТС аруць цаліну, дый то ў незначнай колькасьці. 20 МТС аруць выключна асвоеныя землі. Напрыклад, Жыткавіцкая і Гарадоцкая МТС ніводнага гэктара цаліных зямель не ўзялі.

Трактарацэнтр, ня гледзячы на такое становішча з зябленьнем, ня прыняў да гэтага часу рашучых мер, ня ўдарыў па тых, хто яго ігнаруе.

У Калгасцэнтры загадчык агравытворчага сэктару тав. Лашкевіч кажа так:

— Мы спусьцілі пляны, але цяпер не націскаем на іх выкананьне, бо зараз сяўба, уборка, вось пасьля сяўбы мы пачнем крычаць.

Наркамзем таксама ня прыняў належных мерапрыемстваў, які-б забясьпечылі выкананьне пастановы Наркамзем СССР аб перакідцы 80 проц. трактар[illegible] парку і 25 проц. конскай цягавай [illegible] на зяблева. Апрача гэтага Наркамзем нічога ня робіць аб камандыраванні адказных работнікаў у адстаючыя раёны для разгортваньня зяблева.

Апартуністычная практыка «чарговасьці кампаній» ставіць пад рэальную пагрозу ўздым 1.670 тыс. гэкт. зяблева. Патрэбна неадкладна пераключыць 25 проц. конскай цягавай сілы і [illegible] проц. трактараў на зяблева. А пасьлі сяўбы пераключыць яшчэ 25 проц. цягавай сілы і 10 проц. трактараў. Зяблева трэба перавесьці на ўдарныя [illegible]пы.

Х. Б.

5 ВЕРАСЬНЯ—

адзіны партыйны дзень, прысьвечаны прапрацоўцы лісту ЦК КП(б)Б па партвучобе

ПАСТАНОВА САКРАТАРЫЯТУ ЦК КП(б)Б

ад 23 жніўня 1931 г.

1. У МЭТАХ МАБІЛІЗАЦЫІ ЎВАГІ ЎСЁЙ КП(б)Б НА ВЫКАНАНЬНЕ ЗАДАЧ РАЗГОРТВАНЬНЯ БАЛЬШАВІЦКАЙ ПРАПАГАНДЫ, ПРЫЗНАЦЬ НЕАБХОДНЫМ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ АДЗІНАГА ПАРТЫЙНАГА ДНЯ ВА ЎСЁЙ БССР 5 ВЕРАСЬНЯ 1931 Г., ПРЫСЬВЕЧАНАГА ПРАПРАЦОЎЦЫ ЛІСТА ЦК КП(б)Б АБ ПАРТВУЧОБЕ І НАМЯЧЭНЬНЮ КАНКРЭТНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ЯГО НА ДАНЫМ ПРАДПРЫЕМСТВЕ, САЎГАСЕ, КАЛГАСЕ.

2. ДАРУЧЫЦЬ КУЛЬТПРОПУ ЦК ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ РК КІРУЮЧЫМ МАТАР'ЯЛАМ ПА ГЭТЫМ ПЫТАНЬНІ І ДАЦЬ АПЭРАЦЫЙНЫЯ ЗАДАНЬНІ РАЙКОМАМ І ГАЗЭТАМ АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ АДЗІНАГА ПАРТДНЯ

ЗА САКРАТАРА ЦК КП(б)Б ГАНТМАН.

Прапрацаваць дырэктывы ЦК

ДЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ ПАСТАНОВЫ ЦК, ЯКАЯ СТАВІЦЬ СВАЕЙ МЭТАЙ МАБІЛІЗАЦЫЮ ЎВАГІ ЎСЁЙ КП(б)Б ВАКОЛ ПЫТАНЬНЯЎ ПАРТАСЬВЕТЫ, АРГАНІЗАЦЫЮ СІЛ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ НА ВЫКАНАНЬНЕ ДЫРЭКТЫЎ ЦК КП(б)Б ПА ПАРТАСЬВЕЦЕ НА 1931-32 ГОД, КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б ЛІЧЫЦЬ НЕАБХОДНЫМ РАЙКОМАМ, ГАРКОМАМ І ПАРТКАЛЕКТЫВАМ УЖЫЦЬ НАСТУПНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ:

1. ВА ЎСІХ ПАРТ'ЯЧЭЙКАХ (БЯРУЧЫ ЗА АСНОВУ ПАРТГРУПУ І ЦЭХ'ЯЧЭЙКУ) ПРАПРАЦАВАЦЬ:

а) ПЫТАНЬНЕ ЗНАЧЭНЬНЯ І ЗАДАЧЫ БАЛЬШАВІЦКАЙ ПРАПАГАНДЫ НА НАДЫХОДЗЯЧЫ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД;

б) ДЫРЭКТЫВЫ САКРАТАРЫЯТУ ЦК КП(б)Б АБ ПАРТАСЬВЕЦЕ НА 1931-32 ГОД («ЗЬВЯЗДА» І ІНШЫЯ ЦЭНТРАЛЬНЫЯ ГАЗЭТЫ ЗА 1-VIII—1931 ГОДУ), А ТАКСАМА ДЫРЭКТЫВЫ ЦК УсеКП(б) І ДЫРЭКТЫЎНЫ ЛІСТ ТАВ. ЧАРНУШЭВІЧА (ЗА ВЕРАСЕНЬ МЕСЯЦ);

в) ФОРМЫ, ВІДЫ Ў СЫСТЭМЕ ПАРТ АСЬВЕТЫ, АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ, ЯКІЯ НЕАБХОДНА ЗАХАВАЦЬ ПРЫ АРГАНІЗАЦЫІ СЕТКІ ПАРТАСЬВЕТЫ.

2. РАЙКОМАМ І ГАРКОМАМ І БЮРО ПАРТКАЛЕКТЫВАЎ ВЫЛУЧЫЦЬ АДКАЗНЫХ УПАЎНАВАЖАНЫХ У ЦЭХАВЫЯ, САЎГАСНЫЯ І КАЛГАСНЫЯ ЯЧЭЙКІ КП(б)Б ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ПАСТАНОВЫ САКРАТАРЫЯТУ, ЯКАЯ ВЫШЭЙ ДРУКУЕЦЦА.

3. ПАРТДНЕМ ПА ПАРТВУЧОБЕ ШЫРОКА АХАПІЦЬ БЕСПАРТЫЙНЫХ РАБОЧЫХ І КАЛГАСЬНІКАЎ, АСАБЛІВА ЖАНЧЫН, УЦЯГНУЦЬ УСІХ КАМСАМОЛЬЦАЎ.

ВЫНІКАМ АДЗІНАГА ПАРТДНЯ ПАВІННА ЗЬЯВІЦЦА НАМЯЧЭНЬНЕ І РЭАЛІЗАЦЫЯ КАНКРЭТНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ, ЯКІЯ ВЫЦЯКАЮЦЬ З ПАСТАНОВЫ САКРАТАРЫЯТУ ЦК АБ ПАРТВУЧОБЕ, ПРАВЕРКА СТУПЕНІ ВЫКАНАНЬНЯ ГЭТАЙ ПАСТАНОВЫ, АСАБЛІВА Ў ГАЛІНЕ АХОПУ ПАРТВУЧОБАЙ КАНДЫДАТАЎ І НОВЫХ ЧЛЕНАЎ КП(б)Б.

У ДАПАМОГУ ДАКЛАДЧЫКАМ І АДКАЗНЫМ УПАЎНАВАЖАНЫМ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ АДЗІНАГА ПАРТДНЯ ПА ПАРТАСЬВЕЦЕ НІЖЭЙ ДРУКУЕЦЦА СХЭМАТЫЧНЫ СЬПІС ЛІТАРАТУРЫ, ЯКІ НЕАБХОДНА СКАРЫСТАЦЬ ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДАКЛАДУ, І РАСТЛУМАЧАЛЬНЫЯ ДА СЬПІСУ ЗАПІСКІ ДОМУ КАМАСЬВЕТЫ.

ЗАГ. КУЛЬТПРОПАМ ЦК КП(б)Б.
ЧАРНУШЭВІЧ.

Усім гаркомам і райкомам КП(б)Б

Ніжэйпаказаную літаратуру скарыстайце як для інструктаваньня ўпаўнаважаных да дня партасьветы, так і для самых упаўнаважаных пры падрыхтоўцы дакладаў да гэтага дня.

Райпрапагандыстам і дамам партасьветы падрыхтаваць упаўнаважаных для правядзеньня адзінага партдня па партасьвеце. Яны-ж дапамагаюць ім у падрыхтоўцы матар'ялаў да гэтай работы.

Дом Камасьветы.

Рэкамэндацыйны сьпіс літаратуры аб задачах партасьветы на 1931-32 навучальны год

1. Пастанова ЦК УсеКП(б) — 14-IX-30 г. — «Зьвязда» за 25-IX—30 г., «Пар работнік» № 16 — 1930 г., у «Помог партучобе» № 1 за 1930 г.

2. Дырэктыўны ліст аб разгортваньні сеткі партасьветы на навучальны год «Зьвязда» ад 11-VIII—31 г.

3. На пароге новага навучальнага году ў сеткі партасьветы. «Зьвязда» ад 11-VIII—31 г.

4. Дырэктыўны ліст культпропу ЦК УсеКП(б) (Стэнкі). Усім культпропам ЦК нацкампартыі, краявых і абласных комітэтаў УсеКП(б).

СОМО — Задачы партасьветы, выд. ГІЗ 1931 г.

«Узброімся ленінізмам» — выд. БД 1931 г.

5. Задачы партыйнай асьветы—«Кам. Рэвалюцыя» № 26-29 1930 г., стар. 95.

6. Уласава — Партасьвета ў раёне суцэльнай калектывізацыі. «Кам. Рэвалюцыя» № 12 1931 г., стар. 48.

7. Аб разгортваньні і камплектаваньні сеткі партасьветы на надыходзячы год «Прапагандыст» №№ 22-24 1930 г., стар. 109.

8. Партасьвета на новым этапе. «Партвучоба» № 6-7 стар. 3.

9. Цівель. Элементы тэхнікі ў сетцы партасьветы. «Кам. Рэвалюцыя» № 5-6 стар. 62.

10. Гак. Аб увязцы партасьветы з вытворчымі задачамі, з вывучэньнем тэхнікі. «Кам. Рэвалюцыя» № 5-6 за 1930 год, стар. 44.

11. Папоўкін. Аб падрыхтоўцы партактыву і рабочых прапагандыстаў. «Прапагандыст» № 17-18 1931 г.

1-га верасьня склікаецца

чарговы пашыраны Пленум Менскага Гаркому КП(б)Б

з удзелам членаў бюро партколектываў, і ячэек КП(б)Б, дырэктароў прадпрыемстваў, старшынь фабзаўкамсаюзаў (партыйцаў), сакратароў сельпартканцаў і сельячэек КП(б)Б з наступным парадкам дня:

1. Вынікі перавыбараў бюро ячэек і далейшыя задачы партарганізацыі. (Дакл. тав. КАВАЛЬЧУК).

2. Папярэднія вынікі ўборачнай і асеннай пасеўнай кампаніі і далейшыя задачы па арганізацыйна-гаспадарчым умацненьні саўгасаў і калгасаў. (Дакл. тав. КАРАНЕЎСКІ).

Пленум адкрываецца ў 6 гадзін вечара, памяшканьні Дому Камасьветы (б. клюб Карла Маркса).

Членам ЦК КП(б)Б, члены Пленуму Гаркому і рэвіз. камісіі ўваходзяць па сваіх пасьведчаньнях, а іншыя—па білетах Гаркому, якія сакратары яч. павінны атрымаць у Гаркоме.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

ПРЫЗЫЎ У РСЧА

Жлобін і Віцебск АБАВЯЗАНЫ ліквідаваць адставаньне

НІ АДЛЭЙ ХВІЛІНЫ НЕ МАРУДЗІЦЬ!

Падрыхтоўка да прызыву ў разгары. 7-га верасьня—першы дзень прызыву ў Менск, па раёнах БССР—15-га верасьня.

Перадавыя прадпрыемствы Менску, Гомеля і інш. разгарнулі бялую падрыхтоўку да прызыву.

Але і на сёньняшні дзень многія раёны ганебна цягнуцца ў хвасьце, недаацэньваючы палітычнай важнасьці прызыву.

У Кармянскім і Журавіцкім раёнах не правядзены вайсковыя прызыўнікоў. Сацыяльна-чужыя элементы не адсеяны. Няма ўліку пялісьменных. Ні райвайсканматы, ні мясцовыя арганізацыі гэтых раёнаў не аддаюць ніякай увагі прызыву. Ня лепш стаіць справа і ў Жлобінскім і Віцебскім раёнах, аб чым сьведчаць карэспанданцыі, зьмешчаныя ніжэй.

Ня трацячы ні адной хвіліны, трэба зараз-жа па-баявому выправіць дапушчаныя недахопы. Прызыў—справа ўсіх партыйных, савецкіх, камсамольскіх і прафэсіяўных арганізацый, справа ўсёй грамадзкасьці. На аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва, пераняўшы лепшы вопыт перадавых, трэба нагнаць прапушчанае.

ПА-БАЯВОМУ ЗА РАБОТУ!

Скурат.

Клясавы адбор прызыўнікоў не праведзен

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Падрыхтоўка прызыву праходзіць самацёкам. Райпрафсавет, камсамол і грамадзкія арганізацыі стаяць у бану ад падрыхтоўчай работы. Сацыяльна-клясавы адбор прызыўнікоў не праведзен. Пялісьменныя і малапісьменныя не выяўлены і работы з імі ніякай не праводзіцца.

Жлобінскія раённыя арганізацыі недаацанілі значэньня прызыву.

Трэба зараз-жа пакласьці канец такому становішчу.

МАРЫНІЦКІ.

Аршаншчына па-баявому рыхтуецца да прызыву

Падрыхтоўчая работа да прызыву ў Аршанскім раёне праходзіць пад лозунгам—даць Чырвонай арміі фізычна-здаровага, палітычна падрыхтаванага, пісьменнага і клясава-вытрыманага байца. Па сельсаветах праведзены сходы прызыўнікоў. Адбылася раённая канфэрэнцыя. Прызыўнікі праяўляюць вялікую актыўнасьць.

Сярод прызыўнікоў праведзена падпіска на пазыку «Трэці рашаючы». 117 чал. выпісалі газэту «Чырвонаармейская праўда». Усе пялісьменныя навучаюцца на ліквпунктах.

Гарадзкі савет падрукаваў сьпісы прызыўнікоў і распаўсюдзіў іх па ўсіх прадпрыемствах і ўстановах з мэтай шырокага абгаварэньня і праверкі кожнага прызыўніка на рабочых сходах.

М.

У палоне самацёку

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу. Наш кар.). На прадпрыемствах Віцебску падрыхтоўка да прызыву не разгорнута. АКУЛЯРНАЯ фабрыка, «ДЗЬВІНА», «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ» і ЧЫГУНАЧНІКІ не абгаварылі кандыдатур прызыўнікоў.

Асавіяхім і камсамольскія арганізацыі ўсю справу ўскладалі на адзін райвасмкамат.

Учора і на сёньняшні дзень ня выдулі саматыльны тавар прызыўнікоў. Няма дакладнага ўліку пялісьменных.

Прызыў—на пароге. Віцебскі гарсавет, партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі павінны на-хаду ліквідаваць недахопы і забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне прызыву.

ЗАРУБЕЖНЫ.

Нарада па пытаньні вярбоўкі рабочай сілы для Данбасу

31-га жніўня, у 2 гадз. дня, у памяшканьні рэдакцыі газэты «Зьвязда» адбудзецца нарада па пытаньні вярбоўкі рабочай сілы для Данбасу. Павінны зьявіцца АДКАЗНЫЯ ПРАДСТАЎНІКІ ад БЕЛКАЛГАСЦЭНТРУ, ЦСПОБ, ЛКСМБ, БЕЛКАЛПСАЮЗУ і ўпаўнаважаны «Вугалю». У парадку дня: даклад Наркампрацы тав. Баскіна і інфармацыі прадстаўнікоў вышэйпаказаных устаноў.

РЭДАКЦЫЯ «ЗЬВЯЗДЫ».

Сьпіць бясплянавы абмен будаўнічымі матар'ялам

Пастанова НК РСІ і НКЮ БССР

У апошні час, у сувязі з недахватам некаторых відаў дэфіцытных будаўнічых матар'ялаў, паміж бударганізацыямі і іншымі гаспадарчымі органамі назіраюцца вы

М. ГАПАДЗЕД

Задачы навуковай работы і роля Беларускай Акадэміі Навук*)

На даным этапе перад Акадэміяй Навук стаяць адказнейшыя практычныя задачы, якія маюць вялікае палітычнае значэнне.

Ход клясавай барацьбы ў Беларусі ўзбуйнеў такім чынам, што Акадэмія гэта новая арганізацыя, якую мы стварылі ў 1928 годзе), або вярней, частка з чыслаў, адыгрываўных там выдатную ролю, аказалася на той бок барыкад. Акадэмія — гэта ідэйнае гняздо і замест таго, каб адзіным фронтам змагацца за сацыялізм, частка акадэмікаў апусцілася дапер'е савецкай улады і вяла рабочу супроць яе.

Нам прышлося выкінуць з Акадэміі адтку тых людзей, якія прыняли супроць нас. Прышлося крепка ўзяцца Акадэміяй. Мы вымушаны былі ўвесці на гэта, бо некаторыя людзі працягвалі супроць пралетарскай дыктатуры, на карысць польскага і міжнароднага фашызму.

На тым, што мы далі на руках лаўчыкам польскага фашызму і іншай арганізатараў капіталістычнай інтервенцыі з лагеру беларускага нацыянал-дэмакратызму, зрозумела, хто-небудзь пакуўся і спекулянцуць.

Некаторыя падпалоскі нацыянал-дэмократыі ставілі пытанне і хто-небудзь гэта стаяць і зараз: «Ну, што-ж, у дзіцячайкоў гэта ўсё паказальнае, і нацыянальная палітыка — гэта таксама паказальнае. Усё робіцца для фармы, потым — зноў будзе ліквідавана».

Для кожнага дарослага чалавека, які ведае такі хоць трошкі ўяўдае сабе вас працэсу клясавай барацьбы пратэтарыяту, сусім ясна, што гэтыя гурпкі выкідаць з клясава-варожага нам лагеру. Усім відома, што справа гэта не аб ліквідацыі нацыянальнай культуры, не аб затрымаўцы развіцьця нацыянальнай культуры, як гэта спрыяюць паказаць нацыянал-фашысты і іх літаратура, справа ідзе аб выгрэўшаньні клясавага фронту пралетарыяту, аб ліквідацыі гэтага клясавага фронту, і ліквідацыі лепшых сіл, якія стаць на насыпных пралетарыяту, для чаго, каб хутчэй пушыць справу нацыянальнай палітыкі, каб яшчэ хутчэй пушыць справу нацыянальнай культуры, пралетарыяў на сваім вымсьце і нацыянальнай па форме.

Ва ўсякім разе тое, што мы спускаем і вонасцелых актыўных контр-рэвалюцыянэраў, нашы клясавыя ворагі ва ўжыві выкуцца скарыстаць у сваіх этах.

На гэтым фоне рэарганізаваней Акадэміі Навук трэба напружыць усе сілы на гэта, каб сьцяк нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па вымсьце культуры трымаць высока, і вазтоўную ваку ўзьняць на такую вышыню, каб ім было відаэчна, што мы можам з тым посьпехам арганізаць без нацмуўскіх «вучоных», што ў нас хопіць сіл для таго, каб навуку і культуру, якая нам патрэбна, клясавую культуру рушыць гігантскі тэмпамі перад. І лепш будзе, калі ў нас будзе менш тых людзей, якія перашкаджаюць нам працавць на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Ня трэба забываць, што Беларуская Акадэмія Навук з абвешчана дня пачала зьяўцца вярхоўным органам навукі ў БССР; гэта абстаноўка ўскладае яго большыя абавязкі на нашу Акадэмію і на ўсіх яе работнікаў. А каб адрадаць назву «Вярхоўны штаб навукі», трэба даць працу высокай навуковай якасьці, трэба ўзьняць навуковы аўтарытэт Акадэміі.

Цяпярэшны аўтарытэт у Акадэміі, магчыма, павінен быць, бо аналітычна Акадэмія ў крыдзе яго бывае, на яго і ня будзе; розьніца толькі ў тым, хто ніжэй акадэмі служаць. Наша Акадэмія павінна служыць і ўжо служыць рабочай клясе. Але гэтым справа не вычэрпваецца; дыктаўнае стаіць аб усяме і навуковага аўтарытэту. Таму сьцяк навуковай працуючы мае рашэчае значэнне для Акадэміі.

На даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва развіцьцяй навукі набывае такое значэнне. Канкрэтныя задачы сацыялістычнага будаўніцтва, якія зрад намі зараз стаяць, на мецуць быць выраблены без аўтаматыкі перадовай тэхнікай. Гэта апошняя задача ў дзе чарту ўпірасцца у далейшае разгорнутае работы нашых навукова-дасьледчых установ і мэксымальную ніжку нашай тэарытычнай работы з практычных задачаў, што стаць перад нашай. Гэта ўскладае асабліва абавязкі на ВАН.

Чаму-б, напрыклад, ВАН як належыць не заняцца вывучэньнем нацыянальных багацьцяў БССР?

Нас работа над вышукаўнем рудных і нярудных выкапняў набывае ня такое значэнне. Напрыклад, мы цяпер з-за межы імпартуем шамотную гліну, бо для Магнітагорску, Кузьнецкага басейну, Дняпрабуду і т. д. патрэбна вогнетрывалая цэгла, а ў нас ня, но хапае сваёй шамотнай гліны.

Аказваецца, што шамотную гліну можна і ня ўвозіць. Есьць некаторыя ўзнакі, што ў нас у Крычаўскім раёне ёсьць пласты гэтай гліны. Калі сапраўды ўся гэта справа была-б дасьледавана дасьледчыкам і высьветлена, мы ведаем-б у БССР набудавадь вялікі гігант з тысячамі рабочых, прычым урад мецьмета Саюзу пагнуў-бы на ўсякія капітальныя ўкладаньні для гэтай мэты. Чаму-б ВАН ня ўзяцца за хутчэйшае выкананьне гэтай пазнатной гліны?

Або возьмем тарфяную праблему, яна для БССР мае вельмі вялікае значэньне. З торфем у нас справа ўжо пачалася ў сэнсе скарыстаньня яго, як энергетычнай базы. Асобуд вялікае лепшым доказам гэтага. Зараз мы навіны ўзяцца за хімічную перапрацоўку торфу ў іншыя прадукты. Паколькі мы ў БССР пакуль што не найшлі іншых выкатнай, — будзем больш інтэнсіўна працавадь над торфам.

Доказана, што з торфу атрымліваецца добры кокс, які можа замяніць у вуглевым коксам. Доказана (лабораторным шляхам), што з торфу можна выраблець сыпірт. Сыпірт на даным этапе разглядзіцца тэхнікі ў Саюзе СР можа адыграць вялікую ролю для развіцьця індустрыялізацыі. Чаму торф не пастаўць на выраб сыпірту, а сыпірт да службу індустрыялізацыі (з яго можна выраблець сынтэтычны каўчук)?

Лябараторным шляхам гэта ўжо даказана (выпрацоўка сыпірту з торфу), а вось на прамысловым раёне мы пакуль што ня здолелі гэту справу пастаўць.

Есьць данныя, што ў нас ёсьць пласт вялікаістага торфу, а газорань, што пецыцы на 50 проц. вазнаці ў шыпелых з торфу. Да вайўнягта налазна дадзецца 50 проц. вялікаістага торфу і атрымліваецца добры шыпель.

Яшчэ можна знайсьці цэлы рад способаў узмацнаньня торфу для мет індустрыялізацыі. Я ўжо не гавару аб тым, што торф добра скарыстоўваецца, як удабрэньне. Гэта менш складаны працэс, а ўсё-ж тагі ня скарыстоўваецца ў нас слаба.

Кажуць, што ў БССР знайшлі багатую руду. Адначасова, кажуць, што балотная руда нерэнтабэльна для распрацоўкі, паколькі мы маем вялікарыя наклады высокагатункавай руды ў Савецкім Саюзе. Пры такіх накладах руды, якія ёсьць у СССР і якія перавышаюць сусьветныя запасы, бязумоўна, а балотная рудой нам нижэй высунуцца, каб арганізаваць металургічную базу ўсесаюзнага значэньня. Але трэба да кінца давесьці і гэту справу. Калі чагосьці-небудзь вялікага нельга зрабіць, дык, мабыць, што-небудзь дробнае мясцовага значэньня можа выйсьці.

Ёсьць некаторыя арэхіўныя матар'ялы, якія паказваюць тое, што колісьці на Віцебшчыне быў або хацелі набудаваць металургічны завод на сапраўдным рудзе. Трэба прагледзець гэтыя матар'ялы. Можа сапраўды закон Віцебску ёсьць руда, трэба правесьці дадатковыя дасьледы. Гэта — непасрэдная праца Акадэміі.

Затраты на гэтыя выпукальныя работы над выкапнямі заўсёды сабе апраўдваюць. Ня трэба шкадаваць затрат на такую справу. Прычым у нашых умовах вялікарэйшую ролю адыграюць нярудныя выкапні, напрыклад, фасфарыты (я ўжо ўспаміна аб шамотнай гліне), мергель, крамень; зараз з краменю выраблюць добрую шкляную паперу, а гэта справа ў нас застаецца пакуль што сакаўжнай. У нас у адным раёне ёсьць тагі сакаўжны заводзік, а ўжо з Ленінграда просяць крамень для мынаў і плацяць добрыя грошы за гэта.

На жаль, некаторыя нашы навукова-дасьледчыя інстытуты, некаторыя навуковыя работнікі часта займаюцца другарзнымі разважаньнямі, а не канкрэтнай справай.

Возьмем сельскую гаспадарку і ў прыватнасьці такое канкрэтнае пытаньне, як спэцыялізацыя сельскай гаспадарці БССР. Акадэмія павінна дапамагчы нам зьвесьці канцэрэтныя настрої ў некаторых нашых спэцыялістаў па сельскай гаспадарцы і зьвяшчыць сумненьні, якія заклікаюцца ў тым, што, шобы, разьвіцьцё іншу і кажаньні у нас не патрэбна фарсаваць. Яшчэ нагадваецца такія варыянты ў некаторых спэцыялістаў сельскай гаспадаркі.

Мы ня можам далей у галіне разьвіцьця сельскай гаспадаркі ісьці на такім шляху, каб у нас быў «Мор і Марыльяз» — усяго па-трошку і ў той-жа час усяго не хапае.

Сутнасьць сацыялістычнага планаваньня заключаецца ў тым, каб правільна вызначыць вытворчыя функцыі кожнага раёну СССР.

Паўночны Каўказ, Украіна, Сібір, Сярэдняя Волга, нарэшце прыдзецца абласьці, дзякуючы сваім умовам, могуць стаць і ўжо сталі рэальнай таварна-вожжавай гаспадаркі.

Мы, Беларусь, ня можам зьвяцца таварна-вожжавым раёнам. Мы павінны зьвяцца раёнам таварнай жывёлагадоўлі, тэхнічных культур і кормаўгодаў.

Адначасова мы можам быць і павінны быць з хлебам. Для гэтага патрэбна, каб наша агра-хімікі паправцавалі больш практычна над тым, каб наша беларуская глеба замест 30 пудоў з дзесяціны дала 80-100 пудоў, а ў нас ня так цяжка гэтага дабіцца.

Вуўным-жа таварна-вожжавым раёнам мы ня можам быць. Але ці можам мы застаецца далей распубліканскім пэўнага вытворчага профілю ў сыстэме Савецкага Саюзу? Зразумела, ня можам.

Для жывёлагадоўлі ў нас ёсьць усе пастэвы, але справа гэта вельмі марудна прасоўваецца наперад як па колькасьці, так і па якасьці. Да гэтага часу мы мала зрабілі для палепшэньня пароды жывёлы, ёсьць пасобныя зразкі пляры добра выведзенай буйной рагатай жывёлы і толькі. Па сьвінях ёсьць, праўда, зусім добрыя вынікі. Мы павінны гэту справу як можна хутчэй пасунуць наперад.

Лубяных культуры — лён і канопілі. Праблема мэліяраціі балот у сувязі з задачай разьвіцьця лубяных культур зьяўляецца гігантскай праблемай. Ужо вынайдзен спосаб і практычна ставіцца на прамысловым раёне перапрацоўка пяньку ў бавоўну. А што гэта значае? Бавоўна адразу вырашае цэлы рад праблем, у тым ліку і палепшэньне матар'яльнага забесьпячэньня рабочай клясы. Пянька сама па сабе можа быць скарыстана для многіх галін народнай гаспадаркі, а з перапрацоўкай пяньку ў бавоўну мы гэты сырэц можам скарыстаць для тэкстыльнай прамысловасьці.

Чаму не паставіць рэальную задачу — спэцыялізацыю сельскай гаспадаркі БССР на лініі разьвіцьця лубяных культур, жывёлагадоўлі і зьвяшчэньня з гэтым кармовай базы?

У гэтай справе неабходна больш сур'ёзна і больш рашуча ісьці наперад і сапраўды ператварыць нашу сельскую гаспадарку са спэцыялізацыі гаспадарці оолімскага тыпу ў буйную капіталістычную таварную прамысловую гаспадарку.

Ці можам мы ператварыцца са спэцыялізацыі ў вырабляючы раён?

Бязумоўна, можам. Вытворства лубяных культур і разьвіцьцё жывёлагадоўлі ў такім разьмеры, які-б даў нам магчымасьць пашырыць сыравую і харчовую базу, — гэта і ёсьць ператварэньне ў вырабляючы раён. А набліжа гэтага мы ня толькі можам, а і абавязкова павінны.

Ці можам мы Сярэднюю Азію ператварыць у вырабляючы раён? Хоць Сярэдняя Азія (апрача Казакстану) яе зьяўляецца раёнам вырабляючым па тавэрным збожжы, але паколькі там апоўная база бавоўны для ўсяго Савецкага Саюзу, пастолькі яна зьяўляецца сур'ёзным вырабляючым раёнам.

Вырашыць усе гэтыя пытаньні спэцыялізацыі сельскай гаспадарці БССР без дапамогі навуковай думкі і без удзелу навуковых работнікаў і спэцыялістаў, гэта зусім вазумела, мы ня зможам.

Мы павінны больш інтэнсіўна папрацаваць па ўсіх готых галінах і набліжа нераваранньня БССР са спэцыялізацыі ў вырабляючы раён, чаго-б гэта нам не каштавала.

Трэба адначыць, што ў гэтай галіне вельмі марудна расгортваецца навуковая думка нашых спэцыялістаў. У нас мала вынікаў работы над новымі культурамі; мы топчамся на адным месцы. Назат і лён і канопілі слаба разьвіваем, і навукова-дасьледчыя інстытуты не зьяўляюцца штурмачом гэтай справы.

Іншыя раёны СССР працуюць над увядзеньнем новых культур — валакністых, каўчуконосных культур і інш., а нашы сельска-гаспадарчыя інстытуты зусім мала займаюцца гэтай справай. Прыходзіцца нам самім штурхаць нашых інстытутыкаў на новыя думкі. Больш таго, мы ў народна-гаспадарчым плане прынялі пастанову набудаваць цукровы завод на сапраўдным рудзе. Трэба прагледзець гэтыя матар'ялы. Можа сапраўды закон Віцебску ёсьць руда, трэба правесьці дадатковыя дасьледы. Гэта — непасрэдная праца Акадэміі.

Затраты на гэтыя выпукальныя работы над выкапнямі заўсёды сабе апраўдваюць. Ня трэба шкадаваць затрат на такую справу. Прычым у нашых умовах вялікарэйшую ролю адыграюць нярудныя выкапні, напрыклад, фасфарыты (я ўжо ўспаміна аб шамотнай гліне), мергель, крамень; зараз з краменю выраблюць добрую шкляную паперу, а гэта справа ў нас застаецца пакуль што сакаўжнай. У нас у адным раёне ёсьць тагі сакаўжны заводзік, а ўжо з Ленінграда просяць крамень для мынаў і плацяць добрыя грошы за гэта.

На жаль, некаторыя нашы навукова-дасьледчыя інстытуты, некаторыя навуковыя работнікі часта займаюцца другарзнымі разважаньнямі, а не канкрэтнай справай.

Возьмем сельскую гаспадарку і ў прыватнасьці такое канкрэтнае пытаньне, як спэцыялізацыя сельскай гаспадарці БССР. Акадэмія павінна дапамагчы нам зьвесьці канцэрэтныя настрої ў некаторых нашых спэцыялістаў па сельскай гаспадарцы і зьвяшчыць сумненьні, якія заклікаюцца ў тым, што, шобы, разьвіцьцё іншу і кажаньні у нас не патрэбна фарсаваць. Яшчэ нагадваецца такія варыянты ў некаторых спэцыялістаў сельскай гаспадаркі.

Мы ня можам далей у галіне разьвіцьця сельскай гаспадаркі ісьці на такім шляху, каб у нас быў «Мор і Марыльяз» — усяго па-трошку і ў той-жа час усяго не хапае.

Сутнасьць сацыялістычнага планаваньня заключаецца ў тым, каб правільна вызначыць вытворчыя функцыі кожнага раёну СССР.

Паўночны Каўказ, Украіна, Сібір, Сярэдняя Волга, нарэшце прыдзецца абласьці, дзякуючы сваім умовам, могуць стаць і ўжо сталі рэальнай таварна-вожжавай гаспадаркі.

Мы, Беларусь, ня можам зьвяцца таварна-вожжавым раёнам. Мы павінны зьвяцца раёнам таварнай жывёлагадоўлі, тэхнічных культур і кормаўгодаў.

Адначасова мы можам быць і павінны быць з хлебам. Для гэтага патрэбна, каб наша агра-хімікі паправцавалі больш практычна над тым, каб наша беларуская глеба замест 30 пудоў з дзесяціны дала 80-100 пудоў, а ў нас ня так цяжка гэтага дабіцца.

Вуўным-жа таварна-вожжавым раёнам мы ня можам быць. Але ці можам мы застаецца далей распубліканскім пэўнага вытворчага профілю ў сыстэме Савецкага Саюзу? Зразумела, ня можам.

Для жывёлагадоўлі ў нас ёсьць усе пастэвы, але справа гэта вельмі марудна прасоўваецца наперад як па колькасьці, так і па якасьці. Да гэтага часу мы мала зрабілі для палепшэньня пароды жывёлы, ёсьць пасобныя зразкі пляры добра выведзенай буйной рагатай жывёлы і толькі. Па сьвінях ёсьць, праўда, зусім добрыя вынікі. Мы павінны гэту справу як можна хутчэй пасунуць наперад.

Лубяных культуры — лён і канопілі. Праблема мэліяраціі балот у сувязі з задачай разьвіцьця лубяных культур зьяўляецца гігантскай праблемай. Ужо вынайдзен спосаб і практычна ставіцца на прамысловым раёне перапрацоўка пяньку ў бавоўну. А што гэта значае? Бавоўна адразу вырашае цэлы рад праблем, у тым ліку і палепшэньне матар'яльнага забесьпячэньня рабочай клясы. Пянька сама па сабе можа быць скарыстана для многіх галін народнай гаспадаркі, а з перапрацоўкай пяньку ў бавоўну мы гэты сырэц можам скарыстаць для тэкстыльнай прамысловасьці.

Чаму не паставіць рэальную задачу — спэцыялізацыю сельскай гаспадаркі БССР на лініі разьвіцьця лубяных культур, жывёлагадоўлі і зьвяшчэньня з гэтым кармовай базы?

У гэтай справе неабходна больш сур'ёзна і больш рашуча ісьці наперад і сапраўды ператварыць нашу сельскую гаспадарку са спэцыялізацыі гаспадарці оолімскага тыпу ў буйную капіталістычную таварную прамысловую гаспадарку.

Ці можам мы ператварыцца са спэцыялізацыі ў вырабляючы раён?

